# “ПРА ВОЗЕРА СВІЦЯЗЬ”

Калісьці дзяржаўцам гэтага возера быў князь Мірскі. І вось ён задумаў даведацца, ці праўда, што на дне возера знаходзіцца затоплены горад Свіцязь, як аб гэтым гавораць у народзе.

Для гэтага ён рыхтаваўся тры тыдні. Пабудаваў вялікі карабль, сплёў невад, паклікаў ксяндза. І вось, калі закінулі невад, пераплылі на другі бераг возера. І пачалі выцягваць. Ён быў лёгкі, і яны думалі, што нічога не злавілі. Але калі выцягнулі другое крыло невада, убачылі ў ім цудоўную дзяўчыну з белым тварам, доўгімі распушчанымі валасамі. Адны ад здзіўлення знямелі, другія кінуліся ўцякаць. Тады яна загаварыла голасам, падобным да журчания ручая, які бег у гэтае возера:

— Хоць вы і задумалі дзёрзкую справу, парушылі спакой возера, захацелі даведацца пра яго тайны, то я раскажу вам. На тым месцы, дзе вы бачыце сёння возера, стаяў горад. Князь, які валодаў гэтым горадам, быў у саюзе з навагрудскім князем Міндоўгам. Аднойчы напаў на Навагрудак з магутным войскам рускі цар. Князь разам са сваей дружынай паехаў на дапамогу Міндоўгу. У горадзе засталіся жанчыны, старыя, дзеці, сярод якіх была прыгожая дачка князя. Магутнае войска Міндоўга і войска князя было разбіта, а рускае войска падышло да горада... Тады перад дачкой князя з'явіўся дух і сказаў, што ператворыць горад у возера, а людзей у кветкі. І вось... горад пачаў знікаць, а на месцы яго з'явілася возера, па якому плавалі цудоўныя белыя кветкі-цары.

Сказаўшы гэта, жанчына знікла. Больш яе ніхто ніколі не бачыў. Як успамін аб гэтым кожную вясну цвітуць на возеры кветкі-цары.